КРЫТЫКА, БІБЛІЯГРАФІЯ

ПА АБКАТАНЫМ ШЛЯХУ

ПРОСТА БЫЛО б пахваліць аўтара за актуальнасць тэматыкі, за зварот да праблем вытворчасці ў іх узаемасувязі з пытаннямі маральна-этычнага плана. А свае рахункі да мастацкасці створанага ім прад'явіць у апошнім абзацы, пад традыцыйнай шыльдай: «На жаль...». Але, на жаль, пачынаць даводзіцца менавіта з крытычных заўваг.

Чакае адказу пытанне: чаго дамогся аўтар у параўнанні з першым сваім празаічным зборнікам — «Заводскія світанні»? Ці не паўтарыліся ў новай кнізе былыя пралікі і хібы — павярхоўнасць апісання, скупаватая на мастацкія сродкі вобразная сістэма, слабая індывідуалізаванасць чалавечых характараў?.. І яшчэ не меней важна высветліць: ці ёсць у творы адкрыццё, якое аўтар робіць і для сябе і для чытача, убачыўшы ці адчуўшы ў навакольным свеце нешта такое, чаго да яго ніхто не бачыў і не адчуваў? Няхай яно, гэтае адкрыццё, неабавязкова ўражвае грандыёзнасцю, няхай часам выглядае «камерным», але заўжды нясе ў сабе адбітак творчай індывідуальнасці мастака, навізны яго манеры і даецца аўтару не інакш, як шляхам напружанага пошуку, адсейвання лішняга, штучнага, іншароднага.

А калі мастак звяртаецца да так званай вытворчай тэматыкі, да яго творчых пакутаў дадаюцца цяжкасці, звязаныя са спецыфікай матэрыялу. Недзе там, у нагрувашчванні металу, бетону, пластмас, на стыку тэхналогіі і псіхалогіі, знаходзіцца тое, што называюць чалавечым аспектам вытворчасці, і яго не заўсёды лёгка выявіць ва ўсёй паўнаце і па-мастацку асэнсаваць, не паўтараючы пры гэтым іншых і сябе самога. Што ж, творчы працэс і ў часы Гамера, і ў век НТР быў і застаецца няпростым...

Але, відаць, ва ўсе вякі існавала і спакуса: сысці са сцяжынкі, якую пракладаеш па цаліку, і ступіць на гладкі, абкатаны бальшак, пакарыстацца знаходкамі, ад якіх папярэднікі ўжо, мабыць, адмовіліся... І тады многае, што раней бачылася цяжкім, уявіцца простым і зручным.

Нялёгка шукаць новыя, адпаведныя часу сродкі мастацкага вырашэння праблем чалавека і вытворчасці. Чым імкнуцца да глыбокай, змястоўнай вобразнасці, вядома ж, лягчэй упрыгожыць тэкст чыста знешнімі атрыбутамі вытворчага асяроддзя. Каб чытач адчуў: трапіў ён не абы-куды, а на завод з яго дзелавой мітуснёй, шумамі і рытмамі. У аповесці «Белы чыгун» гукавое афармленне сапраўды ўражвае, проста-такі аглушае, даводзіцца нават наракаць на яго назойлівасць: «жалобна стагналі тэлефоны», «вылі за сцяной вібратары, вытрасаючы з бункераў фармовачную зямлю, адрывіста грукалі машыны, стракаталі кулямётнымі чэргамі адбойныя малаткі», «ашалела выў ротар пескамёта» і г. д. і да т. п.

Вытворчыя атрыбуты вызначаюць і чалавечы побыт, што знаходзіць адбітак у адпаведных эпітэтах і параўнаннях. Напрыклад, сарочка, якую апранае галоўны герой аповесці, малады начальнік цэха Андрэй Астаповіч, «белая, як вокіс цынку». Прапановы па рэканструкцыі цэха, якія збіраецца зрабіць Астаповіч, павінны быць, мяркуе ён, «дакладнымі, як шпіндзель станка...» А калі Астаповіч аднойчы ўзіраецца ў жнівеньскае неба і бачыць у ім зоры, то яны нагадваюць герою «іскры толькі што выпушчанага з вагранкі чыгуну».

Такімі ж штучнымі, аднастайнымі сродкамі карыстаецца аўтар, спрабуючы падкрэсліць дынамізм, напружанасць дзеяння. У кабінеце начальніка цэха бесперапынна грукаюць дзверы; сюды не заходзяць, а забягаюць, нават «улятаюць», з крыкамі, «з лямантам»— нешта здарылася! Паспрабуем дапусціць, што такое бывае і ў жыцці. Але ці варта злоўжываць адным і тым жа, даволі зацяганым, прыёмам?

Так прасцей — вось у чым справа.

Лёгка пакласці рэйкі, паставіць на іх герояў і штурхаць іх у спіну, каб рухаліся, пазбаўленыя ўласнай волі і самастойнасці ўчынкаў. Станоўчыя — любяць сваю работу, няспынна думаюць аб ёй, кахаць умеюць прыгожа і — прыгожых. Адмоўныя — гультайнічаюць, махлююць, але час ад часу і перавыхоўваюцца, за выключэннем самых адпетых нягоднікаў. У раскрыцці характараў адчуваюцца тыя ж аднастайнасць і ардынарнасць.

Не ў тым бяда, што біяграфіі людзей, выведзеных аўтарам у аповесці і апавяданнях, досыць простыя, небагатыя на яркія эпізоды. Мінулае чалавека можна было б адлюстраваць (хаця б некалькімі штрыхамі) так, каб адчулася: герой жывы, непаўторны, індывідуальны ў сваіх рысах. Замест гэтага аўтар абыходзіцца простай біяграфічнай даведкай: «Некалі Астаповіч працаваў у чыгуналіцейным фармоўшчыкам, майстрам, затым служыў у арміі. Пазней завод накіраваў на вучобу ў інстытут, ліцейны факультэт якога скончыў з адзнакай «выдатна». (Заўважым мімаходзь, калі «выдатна», то значыць з «адзнакай». — **П. В.**). У інстытуце ён сустрэў і пакахаў Галю». І далей амаль тымі ж фразамі-канцылярытамі апавядаецца гісторыя кахання Астаповіча і яго будучай жонкі.

Не дужа выразныя і моўныя сродкі, з дапамогай якіх аўтар імкнецца перадаць душэўныя зрухі персанажаў у пераломныя для іх моманты. Вось, напрыклад, характарыстыка ўнутранага стану Адама, зухаватага шафёра з апавядання «Позні рэйс»: «Пачуццё ўрачыстасці з выпадку жончыных імянін межавала са стомленасцю».

Былы металург Мятліцкі з аповесці «Белы чыгун», кранаўшчык Сяргей Грыбоўскі з апавядання «Рабочы сход», пажарнік Цімошка Залушны («Канарэйка»), канструктар Ніна Яроцкая («Забыты вальс») — усе гэтыя персанажы розняцца па сваіх, так сказаць, біяграфічных дадзеных (узрост, прафесія, сямейнае становішча і гэтак далей), але што датычыць унутранага іх вобліку, то тут, безумоўна, ёсць адно і вялікае падабенства: гэтыя людзі не жывыя, а намаляваны на кардоне, ды яшчэ бляклымі фарбамі. Вось вынік недастатковага псіхалагічнага абгрунтавання характараў і ўчынкаў дзейных асоб.

Не знаходзіць паўнакроўнай мастацкай рэалізацыі задума аповесці. Сутнасць «вытворчай» сюжэтнай лініі можна пераказаць у некалькіх сказах. Адстаючы ўчастак завода — ліцейны цэх — узначальвае малады спецыяліст Андрэй Астаповіч. Энергічны, напорысты, ён у хуткім часе наводзіць тут парадак. Цэх пачынае выконваць план. Але раптам адзін з рабочых выпадкова атрымлівае цяжкую траўму, і начальніка цэха збіраюцца звальняць. Але рабочыя дружна заступаюцца за свайго кіраўніка. Сюжэт, адзначым, не вызначаецца навізной. Аднак і ў яго межах дастаткова прасторы для творчага пошуку. Толькі твор расчароўвае...

На прыкладзе аднаго з рабочых, вагранщчыка Косціка Гаўрылюка, аўтар паспрабаваў паказаць, якое дабратворнае ўздзеянне аказвае на душы працаўнікоў разумнае кіраўніцтва. Пад уплывам Астаповіча, а таксама сваёй жонкі Насці, Косцік літаральна праз некалькі дзён перажывае духоўны катарсіс — з адданага рыцара бутэлькі на вачах ператвараецца ў стараннага, шчырага працаўніка. Унутраны змест гэтага ачышчэння перадаецца наступнай фразай: «З таго дня для яго ўсё стала проста і ясна, як гэты завостраны ломік, якім ён штодзень прабівае лётку ў варонцы і цяпер трымае напагатове».

У спрошчаным, аблегчаным варыянце раскрываецца асабістая драма героя. Досыць лёгка перажывае ён смерць жонкі, не дужа балюча ўспрымае загад аб звальненні — і ўзнікае падазрэнне: ці спачувае аўтар свайму станоўчаму герою, ці не абыякавы да яго?

У апавяданні «Зіркатая», дзе расказваецца пра складаны жыццёвы лёс старога калгаснага конюха Антося Ярмаліцкага, з-пад напластавання халодных, павярхоўна-апісальных дэталей не-не дый прагучыць шчымлівая нотка смутку і спачування, і тады аўтару верыш.

Так і не сышоў аўтар з таго абкатанага бальшака, якім даволі зручна і проста было крочыць. Калі ж час ад часу і імкнуўся вырвацца з яго палону — яркага вобраза, свежага, ёмістага слова не знаходзілася. На фоне суцэльнага гладкапісу такія спробы сапраўды выглядаюць нечаканымі, але найбольш уражваюць сваёй штучнасцю і недарэчнасцю. Вось з'яўляецца «сакратарка з вогненна-рыжай прычоскай» (ці мае **прычоска** колер?), а яе калега, цётка Шура, паказваецца «з цыгарэтай у тонкіх, па-жаноцку прыгожых, без манікюру, пракураных ад табачнага дыму пальцах»... Дзіўнае ўяўленне аб жаночай прыгажосці, ці не праўда? Знойдзем у тэксце і «вогненна-шэрыя вочы», і «худыя невыразныя ногі», а пра адну са станоўчых гераінь будзе сказана без аніякай літасці: «У яе здаровым, упітаным целе, як цунамі, бушуюць пачуцці і шукаюць выйсця...»

Закрываючы кнігу, з жалем адзначаеш: не, не адбылося адкрыцця, якога чакаеш заўсёды. Яно было проста немагчыма, бо ў аснове напісанага — свядомая ці падсвядомая аўтарская ўстаноўка на другаснасць, адмаўленне ад творчага пошуку ў надзеі, што выратуюць калісьці апрабаваныя, сцёртыя ад частага ўжытку прыёмы, выратуе тэма.

На абкатаным шляху бывае слізка...

Пятро ВАСЮЧЭНКА.

І. Канановіч. Белы чыгун. Аповесць, апавяданні. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1981.

ПОМНІКІ НАРОДНАГА ЎМЕЛЬСТВА

Калі заходзіць размова пра помнікі гісторыі і культуры, звычайна згадваюцца велічныя архітэктурныя збудаванні, старажытныя гарадзішчы і курганы, помнікі воінскай славы. Але берасцяная вярэнька, гліняная цацка-свістулька, тканы паясок? Нават не кожны зацікаўлены краязнаўца - збіральнік зверне ўвагу на гэтыя традыцыйныя, але, на першы погляд, такія мала прыкметныя творы народных майстроў. Вось і атрымліваецца, што аддзелы матэрыяльнай і духоўнай культуры нашага народа ў многіх краязнаўчых музеях, асабліва раённага маштабу, прадстаўлены звычайна калаўротам, ступай ды лапцямі. Таму недарэмна краязнаўцы, музейныя работнікі, настаўнікі — карацей, усе, хто цікавіцца нашай спадчынай, праявілі такую цікавасць да кнігі «Помнікі этнаграфіі», падрыхтаванай калектывам этнографаў з Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.

Кніга ўяўляе сабой зборнік артыкулаў па асноўных раздзелах матэрыяльнай культуры беларускага народа: дойлідстве, прыладах працы, транспартных сродках, рамёствах і промыслах. Кожны артыкул дае па-энцыклапедычнаму сціслыя, але вычарпальныя звесткі пра матэрыялы, інструменты, характар вытворчасці, канструкцыю, рэгіянальныя асаблівасці таго ці іншага вырабу. Усе артыкулы ілюстраваны здымкамі ці малюнкамі, і гэта вельмі важна, бо сёння ўжо далёка не кожны ведае, што такое, напрыклад, лучнік, рынка, барыла, латуха ці басэтля. Даводзілася назіраць, як музейныя работнікі, размаўляючы з насельніцтвам, нібы своеасаблівую інструкцыю, разгортвалі згаданую кнігу, і справа ішла больш паспяхова.

Асабліва актуальнай праблема збору ўзораў этнаграфіі стала ў сувязі з работамі па стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і быту. Як вядома, ніводзін музей не можа быць створаны сіламі толькі музейных работнікаў. Тым больш гэта датычыць этнаграфічнага музея, бо нешматлікая музейная група не можа ахапіць кожны куточак рэспублікі, зазірнуць у кожны дом. Важкі ўклад у гэтую важную справу могуць унесці мясцовыя энтузіясты, аднак яны маюць вялікую патрэбу ў навукова-метадычнай дапамозе: што і як збіраць? Выданне якраз і ўяўляе сабой такую вось своеасаблівую «інструкцыю».

Возьмем, скажам, раздзел «Ганчарства» (аўтар С. Мілючэнкаў). Горан ды ганчарны круг — вось, бадай, і ўсё, што можа назваць звычайны чытач, калі яго спытаць пра ганчарскае начынне. Аказваецца, яно налічвае больш двух дзесяткаў розных прылад, якія, вядома, павінны быць прадстаўлены ў хаце ганчара з этнаграфічнага музея. Яшчэ больш шырокі дыяпазон ганчарных вырабаў: кухонны, сталовы, гігіенічны посуд, сасуды для піцця, посуд для захавання і транспартавання прадуктаў і ежы, дэкаратыўная і архітэктурна-будаўнічая кераміка, цацкі. Кожная з гэтых груп уключае дзесяткі відаў вырабаў, нярэдка досыць розных у кожным кутку рэспублікі.

Гэткай жа падрабязнасцю і энцыклапедычнасцю вызначаюцца раздзелы «Народнае дойлідства» (У. Гуркоў, С. Цярохін, С. Сергачоў), «Сельскагаспадарчыя прылады працы» (Л. Мінько, Л. Малчанава, М. Лобач), «Дрэваапрацоўчыя рамёствы» (В. Цітоў), «Ткацтва» (Г. Курыловіч), ды і ўсе іншыя прадстаўленыя ў зборніку.

Як правільна адзначаецца ва ўводзінах, дапаможнік не ахоплівае ўсе бакі матэрыяльнай культуры. І ўсё ж шкада, што ў ім не знайшлося месца для раздзела «Народнае мастацтва». Праўда, нельга сказаць, што яно апушчана зусім. Многія яго ўзоры, якія выконваліся як прадметы ўтылітарнага характару (адзенне, мэбля, гліняная пластыка), трапілі ў адпаведныя раздзелы. Але асобныя віды, якія маюць самастойны дэкаратыўна-мастацкі характар (роспіс, аплікацыя саломай, драўляная скульптура, выцінанкі і інш.), аказаліся, на жаль, па-за межамі дапаможніка.

Не хапае і раздзела «Абрадавыя вырабы». А калі больш дакладна, гэта ці не самы неабходны раздзел для такога выдання, бо ні ў адным з нашых музеяў, на жаль, не знойдзеш ні традыцыйнага каравая, ні пернікаў, ні пісанак, ні калядных масак і зорак. А калі на гэта своечасова не звярнуць увагу, то некаторыя звенні народнай спадчыны могуць быць страчаны назаўсёды.

Можна было б указаць і іншыя, больш дробныя пралікі, але ўсё ж нельга не аддаць належнае выданню: яно, без сумнення, стане (і ўжо стала) добрым дапаможнікам, настольнай кнігай для ўсіх тых, хто неабыякавы да нашай спадчыны.

Яўген САХУТА.

Помнікі этнаграфіі. Мінск, «Навука і тэхніка», 1981.

Глыбокае карэнне

По старонках выбраных твораў Аляксея КАРПЮКА

У 1965 годзе ў часопісе «Маладосць» Аляксей Карпюк надрукаваў сваю аўтабіяграфію, красамоўна названую «Мая Джамалумгма». Там ён пісаў: «Для чаго чалавек жыве? Мабыць, для барацьбы за праўду. У мой век праўда знаходзіцца ў вялікіх ідэях камунізму, я за іх змагаўся, як толькі мог. Канечне, часам рабіў гэта няўмела, а часамі груба, але гэта ішло ад неразумення і ўзросту. У сваё апраўданне я прывяду словы Льва Талстога: «...Чтобы жить честно, надо рваться, путаться, биться, ошибаться, начинать и бросать и вечно бороться... А спокойствие — душевная подлость...»

Гаварыў гэта А. Карпюк, маючы за плячамі немалы і нялёгкі жыццёвы вопыт. Прайшлі гады. Пісьменнікам шмат зроблена. Перад намі два важкія тамы ягоных выбраных твораў. Хочацца падкрэсліць: у Карпюка творы менавіта выбраныя. Бо сёння вельмі часта замест «выбраныя» больш дакладна было б пісаць сабраныя і падабраныя: уключаецца ўсё, нават тое, што было напісана яшчэ ў школьныя гады. Мяўляў, няхай чытач бачыць, як ішло станаўленне таленту, няхай ведае, што былі і горшыя творы. Магчыма, чытачу і варта ўсё гэта ведаць (хаця, шчыра кажучы, тут матэрыял хутчэй для даследчыкаў літаратуры), але ці не занадта веданне гэтае высокую цану мае: трэба ж усё перачытаць, часта прымушаючы сябе. Ды, здаецца, некаторых аўтараў «выбраных» такія дэталі мала хвалююць.

Пра Карпюка, пра ягоныя выбраныя творы якраз гэтага не скажаш. А пачынаеш чытаць, перачытваеш раман-быль «Вершалінскі рай», аповесці «Пушчанская адысея», «Данута», апавяданні — і словы з даўняй аўтабіяграфіі пачынаюць гучаць яшчэ з большай пераканальнасцю, з большай праўдзівасцю, чым нават тады, калі былі напісаны. Пражытыя гады, творчасць пісьменніка з усёй сілай пацвярджаюць і сцвярджаюць іх слушнасць, іх праўду.

Аляксей Карпюк адносіцца да тых пісьменнікаў, чыя творчасць народжана жыццём у самым прамым і непасрэдным сэнсе. Яна сваёй рэальнай асновай, падзеямі, сітуацыямі, сваёй ідэйнай накіраванасцю, высокай грамадзянскай і этычнай мэтай з'яўляецца натуральным і неабходным працягам і выяўленнем самога пісьменнікавага жыцця. Паводзіны творчыя і паводзіны жыццёвыя — для Карпюка адзіна непадзельнае; тут адно вынікае з другога, адно абумоўлена другім. Такое ў літаратуры сустракаецца далёка не заўсёды. Вырашальнае значэнне набываюць умовы фарміравання творчай асобы.

Умовы, у якіх прайшлі дзяцінства і юнацтва, прайшла маладосць будучага пісьменніка, былі надзвычай складаныя, насычаны неверагоднымі выпрабаваннямі. У 1934 годзе 14-гадовы хлапчук трапіў пад суд за спробу ўцячы з буржуазнай Польшчы ў СССР. У гады нямецка-фашысцкай акупацыі ўваходзіў у склад падпольнай дыверсійнай групы. У 1943 годзе быў арыштаваны, апынуўся ў канцэнтрацыйным лагеры Штутгоф. Цудам уцёк адтуль. Актыўна змагаўся ў партызанскіх атрадах. Арганізаваў і ўзначаліў атрад імя Кастуся Каліноўскага. З войскамі Савецкай Арміі прайшоў шлях ад Варшавы да Берліна. Быў паранены. Пасля вайны вучыўся ў інстытуце, настаўнічаў у вёсцы, быў журналістам...

Гэтымі вехамі пазначаны жыццёвы шлях Аляксея Карпюка да пачатку творчасці. Пачатак жа творчасці адносіцца да 1953 года, калі з'явілася аповесць «У адным інстытуце». Аўтару тады перавалiла ўжо за трыццаць. Але супастаўляючы ўсё напісанае Карпюком з ягонай біяграфіяй, бачым, што адносна доўгі шлях у літаратуру для яго зусім не выпадковы. Тут ёсць пэўная ўнутраная неабходнасць: дзесьці сам характар таленту патрабаваў гэтага.

Карпюк (і ў гэтым красамоўна пераконваюць творы, змешчаныя ў двухтомніку) піша заўсёды пра тое, што так ці інакш звязана з яго асабістым лёсам, з лёсам блізкіх яму людзей. Творы вылучаюцца моцнай насычанасцю, рэальнымі, жыццёвымі фактамі. У іх грунтоўная аўтабіяграфічная (найчасцей) або дакументальная аснова, па-мастацку як бы непрыхаваная, выяўленая адкрыта. Часамі нават быццам знарок падкрэсленая. Пісьменнік заўсёды (выключэнні — зусім рэдкія) непасрэдна сам прысутнічае ў творы, ён не хаваецца ад чытача за «падстаўных асоб» (сваіх герояў), не ўтойвае асабістых адносін да таго, пра што піша, — людзей, фактаў. Схільнасць да аўтабіяграфічна - дакументальнай жыццёвай напоўненасці твораў арганічна спалучаецца з непасрэдна-адкрытай, шчырай манерай апавядання — то рамантычна-лірычнай, то стрымана дакладнай, публіцыстычнай. Прычым, адкрытасць і шчырасць — рэзка выражаная, недыпламатычная як бы. Творам Карпюка верыш. З ім можна часам не пагаджацца, можна што-нішто адмаўляць, але не верыць нельга. Да таго ж у абгрунтаванні сваёй пазіцыі, у сцвярджэнні сваіх думак аўтар паслядоўны, упарты, палемічны.

Падзеі ўсіх, па сутнасці, твораў пісьменніка адбываюцца ў ягоных родных мясцінах, у тым кутку зямлі, дзе прайшло далёка не заўсёды бестурботнае дзяцінства, напоўненае рамантыкай барацьбы юнацтва, гераічная і драматычная маладосць. Куток гэты (паўночна-заходняя частка Гродзеншчыны, часткова паўночна-ўсходняя Беласточчына) адметны ў многіх адносінах. Населены ён людзьмі розных нацыянальнасцей, рознага веравызнання. А гэта ў пераломныя для народа перыяды жыцця (было ж іх так многа) не магло не выклікаць вострай сацыяльнай і ідэалагічнай барацьбы, не магло не стаць прычынай сур'ёзных непаразуменняў. Умовы жыцця людзей фарміравалі іхні светапогляд, іхнюю псіхалогію.

Усё гэта бачыў, усведамляў, можна сказаць, гэтым жыў і Аляксей Карпюк — пісьменнік, чалавек. Гэта дало рэальную аснову ягонай творчасці, вызначыла ў нейкіх істотных момантах яе характар.

У літаратуры наогул, датычна Карпюка ў прыватнасці, пэўная абмежаванасць геаграфіі ўзноўленых падзей ні ў якой ступені не можа ўплываць на іх ідэйна-мастацкую значнасць. Жыццё — гэта бясконцае мноства палажэнняў, сітуацый, канфліктаў. Для пісьменніка важна іх убачыць у гістарычнай сувязі і абумоўленасці, адчуць і выявіць іх агульназначны змест і духоўны сэнс, ісці ў глыбіню. Такі падыход у найбольшай ступені магчымы ў адносінах да таго, што спазнана табою асабіста, стала, па сутнасці, тваім унутраным набыткам. Узаемаадносіны Карпюка-пісьменніка з рэчаіснасцю менавіта такія. Факты, сітуацыі, вобразы, настрой пераважнай большасці ягоных твораў, у першую чаргу такіх, як аповесць «У адным інстытуце», «Данута», «Пушчанская адысея», «Па кветку шчасця», спачатку былі ім як бы рэальна «перажытыя», а потым ужо набылі мастацкае ўвасабленне. Увогуле ж ёсць усе падставы сцвярджаць, што Карпюк сябе пісьменніка знайшоў у сабе чалавеку, грамадзяніне. Маецца на ўвазе ўвесь аб'ём твораў, найбольш істотныя іх кампаненты. Але аўтабіяграфізм тут не самамэта, не мэта а асноўны прынцып мастацкага адлюстравання і спасціжэння рэчаіснасці.

Узнаўленне перажытага пачалося з падзей самых блізкіх па часе, эмацыянальны настрой, змест якіх адчуваўся непасрэдна, як бы жыў у аўтару. Сучаснасць была прамым іх працягам.

Першыя пасляваенныя гады, іх нягоды і радасці, страшэнныя цяжкасці і безагляднае імкненне да лепшага, вучоба і каханне, спрэчкі пра сённяшні дзень і балючыя ўспаміны пра дзень мінулы — усё гэта складае змест, вызначае ідэйны пафас твораў, якія ўвайшлі ў першую кнігу пісьменніка «Дзве сасны».

Пазней Аляксей Карпюк пачынае ісці як бы ў глыбіню асабіста перажытага, думаць пра крыху больш далёкую гісторыю народа і месца чалавека ў ёй. Так нарадзілася аповесць «Данута», якая прынесла аўтару сапраўдны поспех і шырокую вядомасць. Дарэчы сказаць, што твор выдаваўся на рускай, украінскай, латышскай, польскай і чэшскай мовах. Аповесць вяртае чытача да падзей Вялікай Айчыннай вайны, і далей і больш — да жыцця на «крэсах». Падзеі падаюцца як успаміны Янкі Барташэвіча, галоўнага героя, ад імя якога вядзецца апавяданне.

Герой «Дануты» (а гэта будзе характэрна і для пазнейшых твораў пісьменніка) надзелены дапытлівым розумам, самастойнасцю мыслення, развітым пачуццём чалавечай годнасці. Сэрца ягонае адкрыта жыццю. Ён нясе ў сабе сваё асяроддзе, свой народ; ён прагне грамадскай дзейнасці. А дзейнасць гэтая — барацьба за свабоду народа. Жыццё грамадскае, суровае і гераічнае, падаецца ва ўспамінах героя як абставіны, умовы, у якіх расквітнела і згасла першае, прыгожае і рамантычнае, каханне. Сам пісьменнік у невялічкім уступе да твора зазначае, што «аповесць — гэта каханне, барацьба і геройства», «пра каханне ў бурлівы час вялікіх падзей». Увогуле няшмат у нашай прозе знойдзем твораў, дзе б так лірычна ўсхвалявана, на такой рамантычна-чыстай ноце было расказана пра гэтае вялікае чалавечае пачуццё, дзе б вобраз каханай выпраменьваў столькі пяшчоты, столькі рамантычнай абаяльнасці і чысціні.

Успаміны героя ў творы (а гэта, па сутнасці, сам твор) — адначасна ягоныя перажыванні мінулага.

У лёсе самога пісьменніка, у лёсе ягоных герояў падзеі Вялікай Айчыннай вайны займаюць асаблівае месца. І асабліва праўдзівае, асабліва глыбокае адлюстраванне знайшлі яны ў аповесці «Пушчанская адысея». У лёсе галоўнага героя Алеся Кучынскага вельмі выразна высвечваецца лёс самога аўтара. Адсюль моцная пераканальнасць твора, яго стрыманая ўнутраная эмацыянальная сіла.

У «Пушчанскай адысеі» няма шырокіх, разгорнутых карцін партызанскай барацьбы, мала месца адведзена апісанню баявых аперацый. Увага пераважна скіравана на высвятленне складанага, супярэчлівага працэсу станаўлення і разгортвання ўсенароднага супраціўлення ворагу. З гэтай прычыны пісьменнік значнае месца адводзіць паказу жыцця сялян ва ўмовах акупацыі, паказу партызанскіх будняў. Для пераважнай большасці сялян праца на зямлі, клопаты пра гаспадарку, пра сям'ю непарыўна звязаны з барацьбой з ворагам, складаюць нешта адзінае. Пісьменнік тут ішоў за жыццём: такім яно было ў тыя часы.

Партызанская вайна, якой яна паказана ў Карпюковай аповесці,— вайна народная. Паказана яе складанасць, яе стыхійны ў многіх адносінах характар, паказана ўнутраная неабходнасць узнікнення яе ў тых абставінах, абставінах варожага нашэсця. Супраціўленне нараджалася натуральна, арганічна. Характэрна ў гэтым сэнсе першая сустрэча Алеся Кучынскага з партызанамі. Герой успамінае - расказвае:

«Дагэтуль партызан фактычна не бачыў... Вобраз лясных герояў стварыў сабе сам. У маім уяўленні былі яны людзі рослыя, энергічныя, дужыя і хадзілі асабліва: пружыніста, лёгка, каб не пакідаць слядоў ды не трашчаць галлём...

Усё атрымліваецца не так.

Нават я сярод партызан — самы высокі. І крочаць яны цяжка, няўклюдна, шоргаюць халявамі, спатыкаюцца аб карэнні і пні. На адным чалавеку — вывернуты кажух, на другім — вайсковы шынель, на трэцім — дэсантная куртка, на чацвёртым — палітэчка-рэглан... Скарыпін — камандзір... крыссё шыняля заткнуў за пояс, як рыбак. Танкашыі хлапец трымае вінтоўку на плячы прыкладам уверх.

Хлопцы чамусьці злыя і раздражнёныя: гыркаюць адзін на аднаго, кашляюць, чухаюцца, шморгаюць насамі.

Адным словам.., перада мной... людзі, падобныя больш на дрывасекаў ці рамонтнікаў...»

Потым Кучынскі пераконваецца, што гэта і ёсць людзі штодзённай працы, звычайныя сяляне ў некалькі незусім звычайнай для іх ролі ваякаў. Гэты аўтарскі погляд на партызан характэрны для ўсёй аповесці. Ён ляжыць у аснове мастацкага паказу партызанскага руху як усенароднага супраціўлення. Сцвярджаецца гэта вобразнай сістэмай, маральна-этычнай аўтарскай пазіцыяй, аптымістычнай, здаровай у аснове сваёй атмасферай народнага светаадчування, якая пранізвае ўвесь твор. Гераічнае і звычайнае, трагічнае і камічнае арганічна зліваюцца, ствараючы рэальную карціну жыцця народа ў змаганні за праўду, за светлую будучыню.

Пасля аповесці «Пушчанская адысея», твора, відаць, найбольш аўтабіяграфічнага, Аляксей Карпюк імкнецца як бы адысці ад падзей, непасрэдна ўзятых з асабістага жыццёвага. Яго пачынае ўсё больш цікавіць мінулае непасрэдна тых людзей, сярод якіх ён жыў, жыве, няпростая гісторыя працаўнікоў роднай зямлі. Гісторыя з яе параднага, як кажуць, боку; тая гісторыя, што складае славу народа, тая, якою можна ганарыцца. Але і гісторыя, якую не хочацца прыгадваць, за якую даводзіцца, хочаш ці не хочаш, чырванець. Але што было, тое было.

Так у Карпюка нараджаюцца два падзейна зусім супрацьлеглыя творы: аповесць-хроніка «Па кветку шчасця» і раман-быль «Вершалінскі рай». Адзін пра нязгаснае імкненне народа да свабоды, да сацыяльнай і нацыянальнай незалежнасці, пра тое, як жыццё, асяроддзе, абставіны фарміруюць чалавека, якія сілы ў ім абуджаюць. (На жаль, твор гэты, аповесць-хроніка «Па кветку шчасця», не ўключаны ў «Выбраныя творы»). Другі — пра тое, да чаго можа давесці не проста аднаго чалавека, а народ невыносны сацыяльны і нацыянальны прыгнёт, якое атрутнае зелле можа прарастаць, нават буяць на глебе духоўнай спустошанасці.

«Вершалінскі рай» — раман-быль. Пісьменнік расказвае пра авантуру саматужнага прарока Альяша Клімовіча, цемрашальства сектантаў. Але, даследуючы гэтую авантуру, паказваючы яе шматлікіх удзельнікаў, Карпюк здолеў выявіць яе сацыяльныя і духоўныя вытокі, тую грамадска-гістарычную глебу, на якой могуць узнікаць падобныя антычалавечыя, антынародныя з'явы. «У рабоце над раманам «Вершалінскі рай» ён (пісьменнік.—**С. А.**) дапытаў мо з тысячу дзядзькоў і цётак, дзядоў і бабак»,— сведчыць Д. Бічэль-Загнетава. Напэўна, адсюль, з гэтай моцнай заглыбленасці ў стыхію народнага жыцця, узнікла і сама агульная эмацыянальная атмасфера твора, сама манера выкладання падзей, дзе гумар, з'едлівая іронія, сарказм і нават гратэск займаюць значнае месца.

Сам пісьменнік у гэтым творы прысутнічае таксама як дзейная асоба (у пэўным сэнсе), але не займае галоўнага месца. Ён нібы з сённяшняга дня, з сучасных асабістых і грамадскіх духоўных пазіцый ацэньвае мінулае, выявярае яго сапраўдную сутнасць.

У сваю ж чаргу, мінулае, выяўленае ўсебакова, прымушае больш пільна прыглядзецца да сучаснасці, рэзка акрэслена ўбачыць у ёй і станоўчае, і адмоўнае, шкоднае для нашага жыцця. Вялікая колькасць апавяданняў, замалёвак, напісаных у апошнія гады (яны не ўключаны ў двухтомнік), скіравана пераважна на выяўленне духоўных каштоўнасцей, выяўленне ўнутраных набыткаў і пэўных страт у людзей нашага часу. У выкрыцці адмоўнага аўтар публіцыстычна адкрыты, рэзкі, непрымірымы, адначасна заклапочаны, устурбаваны.

Ідэйны напал, праўдзівасць і разам нязменна рамантычнае імкненне да святла і прыгажосці, якасці, якія так прываблiваюць у лепшых творах Карпюка, народжаны гераічнай барацьбой народа. Сам пісьменнік узмужнеў у гэтай барацьбе, загартаваўся. У ёй — крыніца ягонай духоўнай устойлівасці, чалавечай годнасці, крыніца агульназначнасці таго, пра што піша. Глыбокае карэнне, што лучыць пісьменніка з родным краем, з народам, жывіць ягоную творчасць, напаўняе жыватворнымі сокамі зямлі, робіць патрэбнай і карыснай людзям.

«Ад таго, што жывеш на свеце, трэба, каб і другім людзям лягчэй было».

У гэтых словах, сказаных у аўтабіяграфіі, сутнасць чалавечай і мастакоўскай пазіцыі Аляксея Карпюка, сутнасць таго, што ён робіць і зрабіў (у лепшых сваіх творах) у роднай літаратуры.

Серафім АНДРАЮК.

А. Карпюк. Выбраныя творы ў двух тамах. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1980.